Цана асобнага нумару 20 гр.　　　　　Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 32.　　　Вільня, Аўторак 20 Верасьня 1932 г.　　　Год VIII (XVI)

Беларуская
КРЫНІЦА
Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

На пахілай дарожцы.

(Да справы перадачы ўраду беларускімі полёнафіламі Віленскай Беларускай Гімназіі).

Віленская Беларуская Гімназія апошнімі гадамі была звычайнай палітычнай базай беларускай санацыі і адзінай рацыяй існаваньня гэтай санацыі. Доказам гэтага між іншым служа „Скарынія", арганізацыя часткі беларускіх студэнтаў, якая складаецца пераважна з абсольвэнтаў Віл. Бел. Гімназіі, каторыя на „скарынінцаў" спасбіліся будучы яшчэ вучнямі гэнай гімназіі. Арганізацыя гэна мае сваей галоўнай мэтай не беларускую адраджэнскую працу, але прадусім „зблізэньне" беларусаў з палякамі і вывучэньне беларусаў лёяльнасьці да польскай санацыйнай палітыкі.

Аднак аказалася, што зацікаўленым гэткага кірунку ў беларускай гімназіі і гэткага ў ёй узгадаваньня было яшчэ замала. 19.V. сёл. году Віленскі Школьны Куратар запрапанаваў Бацькаўскаму Камітэту гэтай гімназіі, як яе ўласьніку, перадаць яе на ўласнасьць дзяржавы. Мэты такой прапазыцыі зразумелыя самі праз сябе.

27.V быў склікавы агульны сход Бацькаўскага Камітэту, прэзыдыюм якога быў у большасьці санацыйны. На гэтым сходзе аднагалосна была прынята пастанова, якая адкідала прапазыцыю куратара і выказвала няўхільную волю бацькоў і беларускага грамадзянства мець сваю ўласную самастойную гімназію. Важная гэта пастанова, паўтараем, была прынята аднагалосна, а знача і галасамі беларускіх полёнафілаў.

Тымчасам, відаць, беларускім полёнафілам за гэта, ад каго належыцца, здорава ўляцела, бо 26.VI Прэзыдыюм Бацькаўскага Камітэту склікаў Агульны Сход бацькоў, злажыў з сябе ўсякія паўнамоцтвы, а сам фармальна і фактычна ўцёк з фронту барацьбы за далейшае існаваньне нашай гімназіі. Урэшце на тым-жа сходзе быў выбраны новы Прэзыдыюм Бацькаўскага Камітэту, у большасьці сваей з прадстаўнікоў кірунку ўжо не ўгадовага, а незалежнага, опозыцыйнага і на гэты Прэзыдыюм быў узложаны абавязак клапаціцца аб далейшым лёсе гімназіі.

Прэзыдыюм гэты, ня гледзячы на тое, што атрымаў гімназію ў поўным бязладзьдзі, без граша ў касе, да таго з даўгамі і маючы няпрыхільны да сябе ўрад, павёў працу ў абароне гімназіі дужа энэргічна і ўмела. У рэзультаце гэтай працы, справа гімназіі была ўжо на добрай дарозе. Быў прадстаўлены ўладам для зацьверджаньня новы дырэктар і новы склад пэдагогаў і былі пачынены крокі зьбіраньня ахвяр дзеля ўтрыманьня гімназіі.

Але вось тут стала на дарозе перашкода з таго боку, з якога, судзячы лёгічна, не магло яе ўжо быць. Перашкода гэта паўстала з боку тэй-жа беларускай угоды, якая 16.VI кінула гімназію на яе ўласны цяжкі лёс і сама ўцякла! Аказваецца, угадоўцы да беларускага грамадзянства ня былі лёяльнымі — яны адно гаварылі і рабілі прад беларускім грамадзянствам, а сусім што іншае — прад польскімі ўладамі. Беларускія полёнафілы проста паралізавалі ўсе стараньні Прэзыдыюму Бацькаўскага Камітэту, шкодзячы яму і справе самастойнасьці гімназіі прад польскімі ўладамі. Аказалася такім чынам, што гэны супольны з усім беларускім грамадзянствам пратэст беларускай санацыі процію прапазыцыі куратара быў звычайным палітычным манэўрам, разьлічаным на абяленьне сябе перад беларускім грамадзянствам, а тымчасам фактычныя гэтай санацыі думкі і намеры былі, каб да існаваньня самастойнай беларускай гімназіі не дапусьціць, хоцьбы з тых матываў, што гэтага ня хочуць улады і што паны „нашы" санатары, прыстроіўшыся пераважна пры гімназіі, не падтрымаўшы польскіх урадавых плянаў, маглі-б пацярпець асабіста.

Калі-ж справа гімназіі прыняла абарот цалком памысны і калі выглядала, што яна зможа існаваць, ня служачы мэтам польскай палітыкі, тады санатары, ідучы па думцы польскай палітыкі, пачалі біць адбой. Яны вытужылі ўсе свае сілы, каб гімназію ўзноў захапіць у свае рукі і каб дакапаць з ёй таго, чаго жадалі польскія ўлады — гэта знача перадаць гімназію на ўласнасьць дзяржавы.

Барацьба Прэзыдыюму Бацькаўскага Камітэту за існаваньне гімназіі сталася нязвычайна труднай. Дзяржаўныя ўлады не сьпяшалі з зацьверджаньнем дырэктара і новых вучыцялёў. Тымчасам надышоў школьны год, зьехаліся вучні і за ўсякую цану трэба было пачынаць заняткі. Прышлося запрасіць старых вучыцялёў, якія ў большасьці яўна падтрымлівалі пляны беларускай угоды. Заняткі пачаліся, але лёс школы і палажэньне Прэзыдыюму Бацькаўскага Камітэту сталіся яшчэ цяжэйшымі і бадай безнадзейнымі. Старыя гэтыя вучыцялі з першага дня заняткаў, не зважаючы на цяжкую сытуацыю гімназіі і Прэзыдыюму Бацькаўскага Камітэту, накінуліся на Камітэт з дамаганьнем выплаты ім грошай, ня слухаючы заклiку і просьбы Прэзыдыюму Камітэту пачакаць хоць тыдзень-два покуль патрэбныя грошы будуць сабраны.

І вось з боку санацыі паўстаў новы і рашучы плян барацьбы з самастойнасьцяй беларускай гімназіі. Санацыя гэта, насупроць Прэзыдыюму Бацькаўскага Камітэту, 7.IX склікала пару дзесяткаў бацькоў, выбрала новы, чыста санацыйны Камітэт, пры тым злажаны з цалком безадказных людзей, і даручыла яму пайсьці і папрасіць урад, каб „прышоў і валадаў гімназіяй".

Статутова праўны Прэзыдыюм Камітэту, ведама, гэтага самазванага сходу ня прызнаў і аб гэтай самазваннасьці паведаміў улады. Сябры праўнага Прэзыдыюму Бацьк. К-ту і прысутныя на сходзе бацькі і апякуны з беларускага несанацыйнага грамадзянства „сход" гэны пакінулі. Сутнасьць-жа самазванства гэнага „сходу" у тым, што праўна ён склікаыым быць ня мог бяз з згоды на гэта статутова праўнага Прэзыдыюму Камітэту, а так-жа, і то бадай у найбольшай меры, у тым, што на „сход" прышлі бацькі і апякуны толькі віленскія, а тымчасам вялізарная большасьць бацькоў — прадусім вясковых дзяцей на сходзе, ведама, ня была. На самазваным сходзе было бацькоў менш сарака, а ўсіх у гімназіі дзяцей было тады больш як 120. Знача, менш, як адна траціна бацькоў рашыла аб існаваньні самастойнай гімназіі. Праўда, мы прадбачым, тут нам могуць сказаць, што бадай ніколі больш бацькоў на нашых бацькаўскіх сходах ня бывала і што праўны Прэзыдыюм Камітэту выбраны так-жа гэткімі бацькамі і гэткім больш менш лікам галасоў. Гэта праўда, але адна рэч выбары, а цалком другая рэч пастанова аб ліквідацыі гімназіі, якую ўсё беларускае грамадзянства на працягу 13 гадоў будавала і ўтрымлівала.

З усяго гэтага відаць, што новавыбраны Камітэт ня мае права гімназіі нікому здаваць, а ўзноў-жа ніхто ня можа яе ад яго, прымаць. Тымчасам, калі пішам гэтыя радкі, гімназія ўжо лічыцца філіяй дзяржаўнай польскай гімназіі ім. Ю. Славацкага, бо самазванны Прэзыдыюм Камітэту папрасіў урад, каб той „прышоў і валадаў гімназіяй", на што ўрад згадзіўся.

Надта магчыма, што—дай Божа, каб былі мы благімі прарокамі — лёс гэтай гімназіі лёгка можа быць такі, як і вучыцельскай сэмінарыі ім. Фр. Багушэвіча. А калі можа нейкім „цудам над Вяльлёй" і астанецца гімназія існаваць крыху далей, дык хіба трудна яе будзе назваць беларускай.

У кожным выпадку беларуская санацыя прыпаднясла палякам цалком прыгожанькі падарачак. Што на гэта ўсё ў сваё апраўданьне скажа у „Бел. Звоне" грам. А. Луцкевіч? Ён-жа лідэр, тварэц і галава санацыі!...

З фронту барацьбы з гаспадарчым крызысам.

25.000.000 безработных.

Нямецкае статыстычнае бюро абвесьціла нядаўна найнавейшыя інфармацыі аб безработцы ў цэлым сьвеце. З гэтай статыстыкі даведваемся, што безрабоцьце ўсьцяж расьце.

У Нямеччыне ў 1931 г. безрабоцьце было абхапіўшы 14,2 проц. усяго насельніцтва, а ў 1932 г. абхапіла ўжо 18,0 проц.; у Амэрыцы ў 1931 г. было 4,9 проц., а ў 1932 г. —8,6 проц; у Аўстрыі ў 1931 г.—5,1 проц., у 1932 г. — 7,2 проц. і г. д. Пры гэтым аблічэньні зазначана, што сапраўдны стан безрабоцьця куды большы ад афіцыяльнага.

У канцы першай чэцьверці 1932 году безработных на ўсім сьвеце налічвалася 25 з палавінай мільёнаў. Але гэта толькі самых карміцеляў сем'яў, якія з рук працы ўтрымлівалі сваіх жонак і дзяцей. Дык калі палічым па 4 асобы кожную сям'ю безработнага, то агульны лік людзей, якія апынуліся бяз сродкаў да жыцьця, раўняецца 127 мільённай масе народу.

Гэтае няшчасьце штораз узрастае і ўвесь сьвет знаходзіцца пад пагрозай катастрофы сучаснага гаспадарчага і эканамічна-палітычнага ладу.

Міжнародная гаспадарчая нарада.

Гаспадарчы крызыс, які спарадзіў чалавецтву гэтулькі няшчасьця і пагражае катастрофай сучаснаму ладу, змушае кіраўнікоў гэтага ладу да шуканьня спосабаў забясьпячэньня „правапарадку" і „ратаваньня" галадаючых безработных. У гэтай справе, ўжо ня першы раз, апошнімі днямі адбылася міжнародная гаспадарчая конфэрэнцыя ў Італіі, у невялічкім м. Штрэза. На гэтую нараду зьехаліся прадстаўнікі ад 25 дзяржаў і радзілі над цяжкім эканамічным станам сваіх дзяржаў. Кожны дэлегат радзіў спосаб барацьбы з гаспадарчым крызысам з пункту гледжаньня толькі сваей дзяржавы і ні адзін не адважыўся зьвярнуць увагі на страхацьцё крызысу з пункту гледжаньня агульналюдзкага і паказаць адкрыта на галоўныя прычыны гэтага людзкага няшчасьця. А дзеля гэтага і гэта міжнародная гаспадарчая конфэрэнцыя разьехалася да нічога позытыўнага не дагаварыўшыся.

Сусьветная эканамічная і валютовая конфэрэнцыя.

З гаспадарчым крызысам, як бачым, змагаецца ўвесь пышны XX стагодзьдзя сьвет, але ўсё гэткім спосабам, каб не „панізіць"

свайго гонару і ня стануць поруч „вышэйшым“ з „ніжэйшымі.“ Калі не ўдаецца аднэй конфэрэнцыі асягнуць перамогі над крызысам у адным мейсцы, арганізуецца такая-ж конфэрэнцыя ў другім мейсцы і г. д. як вявёрка ў кружку.

Вось-жа дня 10 г. м. сабралася ў Жэнэве камісія, якая мае падгатовіць сусьветную эканамічную і валютовую конфэрэнцыю. Конфэрэнцыя гэта мае адбыцца ў Лёзаньне і Лёндане.

Вызваленьне народаў і свабодная дзейнасьць гаспадарчых сіл — канец сусьветнага гаспадарчага крызысу.

Венскі эканаміст Рон апошнімі часамі напісаў кнігу, у якой падае спосабы, як можна нападзіць зруйнаваную цяпер сусьветную гаспадарку.

Сяньня, піша Рон, няма аніводнага соцыяліста — марксіста, які-б уважаў сучасны гаспадарчы крызыс за пачатак канца капіталістычнага ладу, на зьмену якога прыдзе лад марксаўска-соцыялістычны і наладзіць сусьветную гаспадарку. Бо і савецкая пяцігодка, якая праводзіцца па думцы марксаўска-соцыялістычнай матэр'ялістычнай філёзофіі, не даецца запярэчыць, што не спаткалася з банкроцтвам у жыцьці практычным. Саветам цяпер, піша Рон, астаецца адно: перастаць плаціць заграцічныя забавязаньні, спыніць далейшую разбудову пяцігодкі і вярнуцца назад да земляробскай прадукцыі. Калі-ж ня гэта, то... дзяржаўны пераварот і паварот да прыватнага гаспадарчага ладу.

Адносна сусьветнай гаспадаркі Рон цьвердзіць: — Саветы паказалі на практыцы няўдольнасьць колектыўнага гаспадараваньня

Галоўныя прычыны сучаснага гаспадарчага крызысу, даказвае Рон, знаходзяцца ўнутры няўдалай сучаснай палітыкі.

Кожная адзінка, а таксама і цэлыя нарады, піша Рон, могуць быць творчымі толькі тады, калі яны жывуць свабодна ў рамах праўнага ладу, а не ў стане насільства—няволі. Толькі свабодная дзейнасьць гаспадарчых сіл у вольным гаспадарчым змаганьні, спыненьне безпатрэбных перашкод, а то й шыкан сяньняшняга замаскаванага ваеннага стану зможа выклікаць на паверх жыцьця вялікія цяпер зьвязаныя гаспадарчыя сілы. А ў сьлед за гэтым прыдзе адраджэньне ўсяго гаспадарчага жыцьця і наступіць агульны дабрабыт.

п—к.

Мала прачытаць газэту самому:
т р э б а
яе прачытаць сабраным суседзям разам!

Праф. М. Біржышка.

24.VIII с.г. мінула 50 гадоў ад нарадзінаў ведамага літоўскага вучонага, прафэсара, пісьменьніка, заслужанага і вялікага народнага дзеяча і палітыка праф. М Біржышкі. 50-цілетні Ягоны юбілей адзначыла ўсё літоўскае грамадзянства бяз розьніцы кірункаў і паглядаў. Юбілей гэты лічым сваім абавязкам адзначыць і мы беларусы, бо праф. М. Біржышка зьяўляецца сапраўды прыяцелем беларускага народу і ягонага народнага адраджэньня.

Радзіўся М. Біржышка 1882 г. у ідвары Вэкшні, на Жмудзі, у літоўскай спольшчанай шляхоцкай інтэлігэнскай сям'і. Бацька быў лекарам, а маці—вучыцелькай. Гімназію скончыў у Шаўлях у 1901 г., а ўнівэрсытэт, аддзел права, у Маскве. Ужо будучы ў гімназіі малады Біржышка чуўся літоўцам і аддаўся пазнаньню літоўскай літэратуры. Вучачыся на ўнівэрсытэце, прымаў жывы ўдзел у літоўскім адраджэнскім руху сярод студэнтаў, за што быў прасьледаваны царскімі ўладамі і трыманы шэсьць месяцаў у вастрозе. Але гэтыя труднасьці маладога і энэргічнага Біржышку ад працы на роднай літоўскай ніве не адстрашылі. Скончыўшы ў 1907 г. ўнівэрсытэт, ён вярнуўся ў край, асеў у Вільні і заняўся адвакатурай, але гэта яму не падабалася і ён замест у судзе, прыняў працу ў банку. Вольны ад банкавай працы час пасьвячаў публіцыстыцы і грамадзкай працы. Пісаў у літоўскія і польскія газэты, некаторы час рэдагаваў „Vilniaus Žinios“, зьбіраў матэр'ял да старой літоўскай літэратуры і шмат працаваў у Літоўскім Навуковым Таварыстве. У 1905 г. быў учасьнікам Літоўскага Зьезду, які літоўцы завуць Вялікім Віленскім Соймам. М. Біржышка ў 1917 г. быў так-жа ўчасьнікам Літоўскай Конфэрэнцыі, якая адбылася ў тэй-жа Вільні і якая стварыла першы літоўскі ўрад — Тарыбу. У 1918 г. быў выбраны сябрам Тарыбы і падпісаў акт абвешчаньня незалежнасьці Літвы.

Яшчэ на пачатку нямецкай окупацыі М. Біржышка разам з др. І. Басановічам арганізаваў у Вільні літоўскую гімназію, якая існуе і сяньня і быў яе дырэктарам аж да 1922 г. У 1919 г. быў літоўскім міністрам асьветы. У 1920 г. браў удзел у літоўска-польскіх перагаворах у Сувалках.

Урэшце 1922 г. М. Біржышка ў ліку „33“, разам з іншымі літоўцамі і беларусамі быў палякамі выкінуты з Вільні ў Незалежную Літву. Тут так-жа разьвіў ён вялікую працу, ужо пераважна на ніве навуковай, як прафэсар літоўскай літэратуры, як дзекан гуманістычнага факультэту, як вучоны і пісьменьнік.

Праф. М. Біржышка, як мы ўжо сказалі, шчыры прыяцель беларусаў. І сапраўды, гэта ня словы, а факт. Ён заўсёды шукаў з беларусамі збліжэньня, заахвочваў іх да адраджэнскай працы і заўсёды, чым толькі мог, памагаў ім. Цікава тут так-жа адзначыць, што М. Біржышка зьяўляецца ідэолёгам беларуска-літоўска-ўкраінскага збліжэньня, над чым „Бел. Крыніца“ так жа працуе ўжо добры дзесятак гадоў.

Дык вось-жа на парозе другога паўвеку жыцьця, у які ўступае праф. М. Біржышка, як дазнанаму беларускаму прыяцелю і вялікаму ідэолёгу беларуска-літоўска-ўкраінскага саюзу, выражаем яму шчырыя — ilgiausiu metu — многія леты!...

М. К.

З беларускага жыцьця.

З жыцьця Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. Гурток БІГіК ў в. Юшкох, Віл.-Троцкага пав. ладзіў 28 м. м. публічную лекцыю аб рэлігіі і нацыянальнасьці. Лекцыю чытаў Старшыня Цэнтр. Ураду БІГіК кс. В. Гадлеўскі з Вільні. Зацікаўленьне лекцыяй было вельмі вялікае.

Набажэнствы для беларускай каталіцкай вучнёўскай моладзі ў Вільні з настаньнем новага школьнага году ўжо ўжо пачаліся і адбываюцца што нядзелю і сьвята а гадз. 10 ай рана ў літоўскім касьцеле сьв. Мікалая (зав. сьв. Мікалая 8). Падчас набажэнства заўсяды пяюцца беларускія рэлігійныя песьні і гаворыцца беларускае казаньне.

З выдавецкае нівы. Вышлі з друку і паступілі ў продажу:

1. „Chryścijanskaja Dumka“ № 9 з датай 15 га верасьня 1932 г. З зьместу на асаблівую ўвагу заслугоўвуюць: стацьця аб сэктанстве, пачатак новай „Betlejki“ — W. A., справаздачы з касьцельных падзеяў у Пінску. Багаты аддзел хронікі беларускай і заграцічнай.

2. „Беларусы ў Літве“ — гэтак называецца брашура, напісаная і выданая грам. К. Езавітавым у Латвіі.

Усе гэтыя і іншыя беларускія выдавецтвы дастаць можна праз Беларускую Кнігарню „Пагоня“, Вільня, Завальная вул. 6—10.

Новая беларуская часопісь. Даведваемся, што ў хуткім часе мае выйсьці ў сьвет у Вільні першы нумар першай у нас коопэратыўна-гаспадарчай часопісі. Часопісь мае называцца „Самапомач“ і выходзіць як месячнік. Рэдактарам гэтай часопісі мае быць інж. Клімовіч, на адрэс катарага (Віль-

В. Багдановіч:

„К сонцу душой!“

Крытычны нарыс творчасьці Я. Купалы з пункту гледжаньня характва і мастацтва.

(У 50-тыя ўгодкі нарадзінаў паэта 25.VI. 1882—25.VI. 1932). (2)

III.

Характэрыстыка творства Я. Купалы з пункту гледжаньня характва ідэовага.

Устанавіўшы такім чынам агульныя асаблівасьці поэзіі Я. Купалы і яго мейсца сярод поэтаў, папрабуем цяпер больш падрабязна разгледзіць яго творчасьць з пункту гледжаньня прыгожасьці, прылажыўшы да яго тую тэорыю красы, якую мы падалі спачатку. Акрэсьліўшы Я. Купалу як поэта, у якога пераважывае ідэя над формай, пачнем крытычны агляд яго творчасьці з боку ідэовага.

Краса Божага сьвету, рэлігійная захопленасьць гэтай красой, прыгожасьць роднай беларускай прыроды, любоў хлапца беларуса да дзяўчыны, любоў маткі да дзяцей, мара аб праўдзе і справядлівасьці на зямлі, романтызм старадаўнай мінуўшчыны, пашана да вялікіх праяваў чалавечае годнасьці, сум аб цяжкой долі беларуса-мужыка, а перад усім любоў да свайй бацькаўшчыны, да свайго народу, мрыя аб яго адраджэньні, прызыў да адраджэнскага руху, — вось тыя галоўныя мотывы, якія складаюць ідейны скарб творчасьці Я. Купалы. Ня можна ня прызнаць, што усё гэта зьяўляецца нават сярод вялікіх поэтаў вельмі рэдкім прыкладам ідэйнай вышыні і прыгожасьці творчасьці нашага поэта, асабліва калі мы прымем пад увагу, што ён **ніколі ня спускаўся з гэтай вышыні**, ніколі не захопліваўся нізкімі ідэямі, не працікаўся тым, што парасейску завецца духам „пошласьці,“ чаго ня ўнікалі нават і вялікшыя поэты „вверяя, як кажа Пушкін, своей лире изнеженные звуки безумства неги і страстей.“ Гэтая асаблівасьць Я. Купалы ізноў ярка выявілася ў Пецярбурскі пэрыод яго жыцьця. Жывучы сярод расейскіх поэтаў, у якіх якраз у той час панавалі гэтыя „изнеженные звукі,“ калі найлепшыя расейскія поэты ня ўстрымліваліся ад апяваньня цялесных патрэб, нізкіх інстынктаў (розныя „Наўі чары“, „Ананасы в шампанском“ і г.д.), дапамагаючы гэтым моральнаму разлажэньню расейскага грамадзянства, Янка Купала ня толькі не паддаўся агульнаму настрою, але ён і зусім неяк прайшоў яго не зачапіўшы. Творчасьць Купалы і ў гэты пэрыод асталася на той самай вышыні романтычных ідэалаў, а нават і павысілася й значна разьвілася ў гэтым кірунку.

Наогул этапы паступовага разьвіцьця творчасьці Я. Купалы прасьлядзіць дужа лёгка, бо яны як вехамі адзначаюцца выданьнямі яго твораў.

„Жалейка“ (Пецярбург з 1908г.) — зборнік першых твораў поэта. Ён абыймае першы, вясковы пэрыод яго творчасьці, калі ён яшчэ „пяяў“, „як Бог палажа на душу“. Гора вясковага мужыка, у якога „няма хлеба, няма солі,“ „голад у хаце, холад у хаце ды і скаціне корму ня хваце,“ якому кепска, „ой кепска жыці ў няволі,“ мара сялянскага хлапца „зьвіць ціхае гнёздка“ з любай дзяўчынай — вось галоўныя тэмы гэтага зборніка. Нават слаба тут яшчэ выражана нацыянальная й соцыяльная ідэя.

Поэт яшчэ й сам ня высокага аб сябе зданьня й называе сябе ня сокалам і не салаўём, а толькі маленькім „вірабейкай.“

Куды больш сьвядомым і сьмелым зьяўляецца Купала ў другім сваім зборніку „Гусьляр“ (Пецярбург 1910). Тут ён ужо не „вірабейка“, а сьвядомы чараўнік слова, які нясе людзям „дум вялікіх чар“ і зачароўвае іх сваёй песьняй. Голас яго як „фалі мора,“ ён гучыць „на цэлы сьвет“. Адраджэнскія мары яго абформліваюцца і набываюць нейкі новы філёзофскі характар. Нажаль, гэты пэрыод злучыўся з цяжкім рэакцыйным пэрыодам, калі аслаблі надзеі Я. Купалы на адраджэньне бацькаўшчыны, і зборнік гэты дыхае часовым пэсымізмам, які заўсёды, як мы ўбачым далей, паніжае творчыя сілы Я. Купалы.

Найвышэйшай праявай разьвіцьця таленту Я. Купалы зьяўляецца зборнік „Шляхам жыцьця“ (1913 г.). Жыцьцё сярод беларускай і расейскай інтэлігенцыі, спачатку ў Пецярбурзе, пасьля ў Вільні, заняцьце польскай літэратурай, слуханьне лекцыяў на Чарняеўскіх курсах, — усё гэта шмат пашырыла сьветапагляд поэта, дало яму многа ма-

ня, Полацкая 4—10) можна і трэба ўжо надсылаць усякія матэрыялы (карэспандэнцыі) і падпіску, якая да канца гэтага году выносіціме 1 зл.

Увязьненыя б. паслы „Грамадаўцы“ і „Змаганцы“ вызвалі ў Радавую Беларусь. У чацьвер 15 г. м., паводле вестак польскіх газэт, адбыўся абмен палітычнымі вязьнямі паміж Польшчай і Саветамі. Па водле гэтых-жа газэт, Польшча выдала Саветам і ўсіх засуджаных б. беларускіх паслоў з Грамады і Клюбу „Змаганьне“, акрамя б. пасла Б. Тарашкевіча.

Кража ў беларускай Кнігарні „Пагоня“. Уночы з серады на чацьвер 16 г. м. нявыкрытыя дагэтуль злачынцы, дастаўшыся ў памешканьне „Пагоні“, падабранымі ключом адчынілі шуфляду стала і выбралі стуль больш 60 зл. гатоўкай.

Дзе коратка, там і рвецца.

З РАДАВАЙ БЕЛАРУСІ.

Звальненьне з вастрогу праф. Курыловіча. Паводле вестак польскай прэсы выпушчаны быў у Менску на вольнасьць праф. Курыловіч, які за „нацыянальны ўхіл“ быў вязьнены ад 1930 г.

Праф. Курыловіч паважна хворы на сухоты і ў хуткім часе мае выехаць лячыцца заграніцу.

Полёнізацыя Беларускай Акадэміі Навук у Менску.

Заграмічныя газэты падаюць, што апошнімі часамі комуністычныя ўлады Радавай Беларусі назначылі віцэ-прэзыдэнтам Беларускай Акадэміі Навук у Менску ведамага польскага камуніста, б. пасла польскага Сойму, Домбаля, які ў 1923 годзе дастаўся ў Саветы шляхам вымены вязьняў Саветаў з Польшчай.

Як бачым, камуністы, пасьля вызначэньня на этнографічнай Беларусі польскага нацыянальнага раёну (Койданаўшчыны), прыступаюць да апалячваньня і цэнтралі беларускай навукі. Словам, у беларускіх інстытуцыях камуністы ўсім мейсца даюць, толькі не беларусам. Беларускіх вучоных яны высылаюць у глыб Расеі, а беларускую работу даюць рабіць: палякам, маскалём, жыдом і іншым. Карысьці ад такой работы чужынцаў беларускаму народу спадзявацца ня прыходзіцца.

З украінскага жыцьця.

Суровы прысуд. У першых днях верасьня с. г. перад львоўскім судом прысяжных праз 4 дні цягнуўся суд над шасьцю ўкраінскімі дзяўчамі, якім польская пракуратура закідала ўчасьце ў Кангрэсе украінскіх нацыяналістаў у Вене, у 1929 г. На ўспомненым кангрэсе меліся быць ухвалены процілольскія рэзалюцыі.

Абвінавачаныя, дзеля непрачытаньня ім акту абвінавачаньня ў украінскай мове, адмовіліся ад сазнаньняў да фармальнага акту абвінавачаньня. Рашгу сазнавалі.

Суд аднаго з абвінавачаных апраўдаў, а пяцёх: З. Пэлэнская, О. Бабій'я, Др. Васіяна, Бойдуныка і Лэнкаўскага — засудзіў на 4 гады катаргі кожнага, разам — на 20 гадоў.

З Польшчы.

Трыумф і сьмерць. У першых днях г. м. кончыліся ў Бэрліне міжнародныя перагонкі на аэраплянах. Да мэты першым прыляцеў афіцэр польскай арміі Фр. Жвірка, які і атрымаў нагароду 4 000 даляраў.

Усьлед за тым тойжа Жвірка ляцеў дня 11 г. м. на аэраплане ў Прагу, на новае лятунскае сьвята, але над самай амаль чэскай граніцай ягоны апарат зваліўся на лес і разьбіўся, а сам паручнік Жвірка забіўся на мейсцы. — Уся Польшча як перш вельмі цешылася, так пасьля гэтай катастрофы засмуцілася.

Пры мейсцы зазначыць трэба, што пар. Жвірка паходзіць з нашых зямель, з Сьвянцян (Віленшчы а).

Дзяржаўны дэфіцыт (недабор) за м-ц жнівень, паводле даных статыстычнага бюра, выносіць 18 мільёнаў злотых: расходу за гэты час было 180 міл. зл., а прыходу — толькі 162 міл. зл.

Штрайкі ня спыняюцца. На Горным Сьлёнзку яшчэ штрайкуе 9 тысяч работнікаў — мэталёўцаў, якія дамагаюцца перад усім заплаты ім даўно зароблених грошаў. — Ня спыняцца. таксама штрайк і ў нафтовых капальнях у Галіччыне. Гэты апошні штодзень каштуе 43 тысячы даляраў.

Цукар мае патанець на 1-га кастрычніка с. г. на 11 грашоў на кг.

З заграніцы.

У СССР — паводле газэтных вестак — мае дайсьці да адстаўкі Сталіна. Мейсца ягонае меўбы заняць дагэтуляшні камісар вайны Варашылаў, ад якога агульна чакаюць рашучай зьмены курсу ўнутранай палітыкі на карысьць вёскі.

У Нямеччыне палажэньне разьвіваецца шыбка далей як на ўнутраным, так і на вонкавым палітычным фронце. Прэзыдэнт Гіндэнбург выдаў новыя дэкрэты „крызысовыя,“ за каторыя Рэйхстаг выразіў амаль згодны недавер ураду фон Папэна. За гэта адзак і сам Рэйхстаг быў узноў распушчаны і новыя выбары назначаны на 6 лістапада с. г.

Іншым дэкрэтам прэзыд. Гіндэнбурга створана дзяржаўная арганізацыя фізычнага выхаваньня, на чале якой пастаўлены ген. ф. Штюльпнагель.

На становчы крок узлабіўся ўрад фон Папэна і ў заграмічнай палітыцы: ён адмовіўся супрацоўнічаць у г. зв. Міжнароднай Камісіі Разбраеньня, якая гэтымі днямі пачынае ўзноў „працаваць.“ Прычынай да гэтага паслужыла становішча Францыі, якая найбольш праціўіцца прызнаць Нямеччыне права на роўнае з усімі збраеньне.

У Францыі 14 г. м. сьцялі галаву Гаргулову, расейскаму эмігранту засуджанаму за забойства прэзыдэнта Францыі Думэра.

На Далёкім Усходзе грыміць далей. Японцы прызналі Манджурыю незалежнай дзяржавай і занялі кітайскі г. Нанкін. Гэтым Японія ідзе ўжо проста супроць афіцыяльнай волі Лігі Народаў, а Кітай грозіць, што калі Японія не ўціхамірыцца, дык ён злучыцца з Саветамі... І так у кола.

Гандзі, змагар за волю Індусаў, мае быць звольнены з ангельскай турмы. Але ён намераны ўжо 20 г. м. пачаць галадоўку, калі ангельцы не адменяць свайго выбарнага закону аб тварэньні асобнай курыі для „найніжэйшай“ касты індускага насельніцтва, г. зв. парыяў.

З краю.

Колькі маем вайсковых асаднікаў? — Паводле віленскага „Słowa“ у Віленшчыне маем 1036 сем'яў вайсковых асаднікаў на 17 тыс. гэктараў, у Наваградчыне — 1642, на 30 тыс. гэктараў, у Горадзеншчыне 700, на 11 тыс. гэктараў і на Палесьсі 1262 на 30 тыс. гэктараў.

Да ўсяго гэтага кожны асаднік мае ў сябе каля 6-ох тысяч зл. пазычкі. Паўтараем, што гэтта мова толькі аб асадніцтве вайсковым.

Страшныя буры праходзілі апошнім часам над паветамі Браслаўскім і Дзісенскім. 13 г. м. гэткая бура застала 2-х людзей на Гузавым возеры каля Канстанцінава Браслаўскага пав. і затапіла іх. — 15 г. м. над Дзісной пранеслася бура страшнай сілы, якая пазрывала стрэхі з 15 хат, павырывала з карэньнем каля 50 дрэваў, а на Дзьвіне і Дзісьне павываročывала некалькі лодак, ад чаго ўтапілася 4-ох людзей.

Б'юцца і забіваюцца на вясельлі. У сяле Лявонавічы, Мёрскай гміны, Браслаўскага пав. анагдай падхмеленыя вясельнікі пачалі між сабой біцца. Брат маладой, Максім Ходас прыплаціў гэту бойку сваім жыцьцём. Ці-ж-бы да гэтага дайшло, калі-б людзі замест гарэлкі больш цікавіліся добрай кніжкай-газэтай?

тэрыялу й павялічыла творчую энэргію. Пад уплывам польскіх романтыкаў зьмяняюцца яго адносіны да природы, якая робіцца ўжо ня мёртвай аздобай сьвету, але нейкай жывой стыхіяй, любоў — ня простая мара аб „мяшчанскім шчасьці“ („ціхае гнёздка“), але нейкая самастойная сіла, якая акрыляе творчасьць чалавека, палымае яго дух. Вера ў адраджэньне бацькаўшчыны палымае гэты дух яшчэ больш:

„Занімай, Беларусь маладая мая,
Свой пачэсны пасад між народамі!“

Сам ён тут ужо ня толькі гусьляр, які чаруе душы слухачоў сваімі салодкімі песьнямі, а ўжо павадыр свайго народу, які будзіць яго ад сну, заклікае да барацьбы за лепшую долю, які сам рвецца „к сонцу душой“ і заклікае ўсіх „да сонца і зор.“ Краса ідэйнага зьместу гэтага зборніку дасягае найвышэйшай ступені, ня гледзячы на тыя ўплывы, якія, як мы бачылі вышэй, маглі-б скіраваць яго на іншую дарогу.

Астатнімі вехамі творчасьці Я. Купалы зьяўляюцца зборнікі „Спадчына“ (1922 г. Менск) і „Безназоўнае“ (1924), якія адпавядаюць пэрыоду рэвалюцыі і ўтварэньня Савецкай Беларусі. Рэвалюцыя спачатку ахапіла душу поэта. Але й тут трэба адзначыць, што яна цікавіць яго ня гэтулькі соцыяльным бокам, колькі нацыянальным, як тая сіла, якая павінна вывесьці яго бацькаўшчыну „на пачэсны пасад між народамі.“ Асабліва гучнымі й яркімі зьяўляюцца тыя песьні Купалы, якія напісаны ў першыя месяцы пасьля рэвалюцыі, калі адзін за адным рабіліся зьезды й нарэшце наступіла абвешчаньне Народным Зьездам незалежнасьці Беларусі. „Паўставь народ, прачніся, Беларусе“, — заклікае ён („Сп.“ 14)

„Час склікаць ужо грамаду,
На вялікую нараду,
На вялікі сход!
Хай разсудзіць, хай разважыць,
Слова цьвёрдае хай скажыць,
Скажыць сам народ.
(„Сп.“ 15).

Захоплівае яго спачатку й стварэньне Савецкай Беларусі:

„То ж яна з мужыкоў,
А як выйшла у людзі!“

Але скора ў поэзіі Купалы зьяўляюцца й праявы нейкай „казённай“ рыторыкі, замест запраўднай поэзіі. Яркія вобразы зьмяняюцца траскучымі фразамі, напамінаючымі ня лепшыя Дзяржавінскія оды:

„Забівае ў славе буйнай,
Зьзявініць залатаструннай
Родны край адной камунай.

Ці яшчэ горай у другой „одзе“: на сьмерць таварыша Сьцяпана Булата:

„Ты хапаў за косы сонца,
Думаў думу аб пяруне,
Што дух збудзе ўсей старонцы,
Сьні, таварыш, аб камуне“

(Якраз, як Дзяржавін аб Суворове: „ляжет на горы, — горы трещат“).

Трудна думаць, каб Купала ня бачыў, жывучы ў Менску, што доля яго мужыка з вёскі ня толькі не палепшала, але нават і пагоршылася з таго часу, калі ён пісаў: „няма хлеба няма солі, бяз грошы працуй.“ Ня дарма й сярод гэтых казённых урачыстых пахваў „дыктатуры пролетарыяту“ мімаволі прарываецца й думка аб нейкіх бедах яго любай бацькаўшчыны:

...О так, я пралетар!
Яшчэ учора раб пакутны,—
Сягоньня я зямлі ўладар
І над царамі цар магутны!
Мне бацькаўшчына—цэлы сьвет,
Ад родных ніў я адвярнуўся,
Адно... ня збыў яшчэ ўсіх бед:
Мне сьняцца сны аб Беларусі!

Відаць ваш пясьняр тут, як гаворыцца, сам троху на сябе „наклапаў.“ Відаць ня зусім яшчэ „адвярнуўся ад родных ніў,“ але як не стараецца пасавецкаму загаду адвярнуцца ад іх, сялянскае гора не дае яму супакою, ён „не пазбыў яшчэ ўсіх бед“ і яму, гэтаму „магутнаму цару“ усё яшчэ „сьняцца сны аб Беларусі.“ Адкуль тут брацца гэтым трывожным снам, калі-б там было ўсё так добра, як пяецца ў афіцыяльных „одах“? Відаць праца поэта йдзе ня ў лёгкіх варунках „прымусовай нячырасьці, бо паміж радкоў яго вершаў чуецца ў душы поэта нейкая трагедыя. Не дарма і Савецкая крытыка (Жылуновіч. Я. К. у літэр. крытыцы. 40) заўважыла, што „у апошнія часы творчая праца Я. К. шмат цішэйшая, чым была раней. Ня дзіва: „ціяць у няволі — ня можна.

Да нас пішуць.

ЧАМУ НАШ ПЯТРУК НАЛЕЖАЎ ДА ПОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ.

Скурцішкі, Браслаўскага пав. У нашых ваколіцах ёсьць дзейны хлапец, імя якога Пятрук. Наш Пятрук, па прыродзе сваёй, грамадзкі хлапец, але да гэтай пары ня ведаў хто ён і што трэба рабіць, каб прыслужыцца народу дзеля палепшаньня яго долі. Чытаў ён польскую панскую газэту „Gospodarz Kresowy" і належаў да розных польскіх арганізацыяў. Быў ён у „Стов. Млодз. Польскей," запісаўся ў „Коло Млодз. Вейскей" і належаў да „Б.Б.С. з У." Аднак нідзе ня мог ён знайсьці задаваленьня, дык узяў ды запісаўся йшчэ і ў „Фэдэрацыю" (Польскі Звёнзак Оброньцаў Ойчызны). Купіў высокую шапку з літарай „F" і хадзіў, як які кароль. Калі хто пытаў у яго, дзеля чаго ён запісваецца ў польскія арганізацыі і якая мэта гэтых арганізацыяў, дык цьвердзіў адно: усюды мае павагу, у бядзе будзе мець помач і нават у шпіталі дадуць зьніжку на палавіну.

Але вось здарылася няшчасьце ў гаспадарцы нашага Пятрука — згарэла хата. Прыехала камісія, агледзіла вогнішча, а адпаведныя ўлады затрэбавалі заплаціць незаплачанай раты страхоўкі і тады абяцалі за два тыдні выдаць страховачныя грошы за згарэўшую хату. Наш Пятрук усё гэта выканаў, чакаючы страхоўкі купіў на вэксалі дзерава на будоўлю і пачаў спаганяць належную страхоўку. Некальні разоў адведаў гміну, гаварыў з войтам, хадзіў і да паветавага старасты, а страхоўка і да гэтай пары ня прыходзіць. Зазлаваўся наш Пятрук і выпісаўся з усіх польскіх арганізацыяў; пачаў пазычаць у суседа „Бел. Крыніцу," чытае і расказвае, што ніхто нашаму народу не паможа здабыць лепшай долі і трэба нам самым змагацца за нашу волю і долю.

Я. Падавалка.

КРЫХУ АБ КОМАСАЦЫІ І МЭЛІОРАЦЫІ.

Молчадзь, Наваградзкага пав. Каб перайсьці з церазпалоснай гаспадаркі на гаспадарку хутарную, трэба правясьці комасацыю(сцаленьне)церазпалосіц, а каб направіць топкі грунт на ўраджайнае поле, трэба правясьці мэліорацыю,ці прасьцей кажучы—асушку грунту.Як адна справа,так і другая патрабуюць няма́ла работы, ну і ведама—грошай. Гэтую рэформу землярobскай гаспадаркі нельга правясьці самым гаспадаром, без дапамогі ўраду. Тут патрэбна на загаспадараваньне новым гаспадаркам безпрацэнтавая доўгатэрміновая пазыка і фаховая сіла дзеля правядзеньня гэтай рэформы, а так-жа фаховая кантроля гэтай дзейнасьці.

Пры гэтым патрэбна і прырэзка зямлі малазямельным гаспадаркам, бо няма ніякага сэнсу ўкладаць працу і грошы ў карлікагаспадарачку, якая і пасьля комасацыі не направіць сваей здольнасьці да адпаведнага земляробскага варштату працы з прычыны геомэтрычнай вузасьці сваей тэрыторыі. Дзеля гэтага, пакуль праводзіць комасацыю, трэба правесьці праўна надзелы зямлёй малазямельных і беззямельных сялян. А прырэзаць малазямельным і надзяліць беззямельных сялян ёсьць чым— двароў шмат і вялікія.

Але ў нас робіцца наадварот. Праводзіцца комасацыя бяз прырэзкі зямлі малазямельным гаспадаркам і моўчкі абмінаюцца беззямельныя сяляне, якія прымушаны служыць па дварох або цягацца па запашках.

Гэткае землеўпарадкаваньне здаваляе часткова, бо не цалком, толькі малую частку нашага сялянства мацнейшых гаспадароў, якія йшчэ маюць па 10—15 або 20 гэктараў зямлі. Але ў многіх выпадках і гэтая частка сялян нават зусім працівіцца цяперашняй комасацыі, бо пры сучаснай хутарызацыі і гэтая частка гаспадарак быццам за лепшы гатунак грунту траціць на карысьць вялікай большасьці дробных гаспадарачак па 2-3 гэктары абшару. У выніку гэтай рэформы ўсе незадаволены: — буйнейшыя незадаволены, бо страцілі па 2 3 гэктары зямлі, а дробныя незадаволены, бо да карлікавай гаспадарачкі дасталі прыбаўку ня больш 1-2 гэктараў і за гэта атрымалі грунт горшага гатунку. Апрача гэтага, зараз-жа пасьля такой комасацыі трэба перабудоўваць гаспадарку і трэба плаціць за правядзеньне хутарызацыі. Як падрахуе наш селянін усе карысьці з комасацыі і выдаткі на яе, дык выходзіць, што аўчынка нявартa вырабу. Дзеля гэтага нашы сяляне і працівяцца комасацыі.

Працівяцца нашы сяляне і мэліорацыі, бо вельмі дробныя маюць гаспадарачкі. Мэліорацыя таксама патрабуе шмат працы і грошай, а гаспадаркі нашага сялянства ў большасьці такія, якія і пры высокай земляробскай культуры, пры ўраджаю, як кажуць, каб і з нівы валілася, ня могуць пракарміць сярэдняй сялянскай сям'і. Дык зусім зразумела, чаму наша сялянства мала зацікаўлена паднясьцем земляробскай культуры і працівіцца мэліорацыі, якая патрабуе, хоць і на малым абшары, нямала працы і коштаў. Селянін наш зварачвае цяпер увагу на адно — каб як-небудзь пракарміць сям'ю, а далей — Бог—бацька.

Вось прычыны зьнеахвочаньня нашага сялянства да комасацыі і мэліорацыі.

Селянін.

Наша пошта.

Падавалку. Дзякуем, карыстаем. Верш перадалі ў „Шлях Моладзі." З Вашага пісьма ня відаць ці жыве Вашага бацькі бацька або калі памёр. Калі жыве, або памёр больш 10 гадоў таму, дык сястра Вашага бацькі нічога ня выйграе.

Чаю. Атрымалі, дзякуем, скарыстаем.

Чаплі. Атрымалі, папраўіўшы надрукуем.

Сабалеўскаму. Газэту пасылаем акуратна. У прошлым м-цы выйшла 2 разы, а ў гэтым выйдзе 3 разы

Сьвяшч. Каўшу. Газэту акуратна будзем пасылаць ад 1.X.

Ластаўка. Адрэс пераменім ад 1.X.

Бегуну. Карэспандэнцыі не надрукуем, пішэце аб паважнейшых справах.

Недаступнаму. Дзякуем, карыстаем, пішэце часьцей.

Д-ру Пятроўскаму: Просьбу спаўняем. Не забудзьцеся і аб нас.

ДЫРЭКЦЫЯ

Віленскае Беларускае Гімназіі

паведамляе

што з пачаткам гэтага школьнага году ўтрыманьне гімназіі пераходзіць на дзяржаўны кошт.

Прыймо вучняў уво ўсе клясы, апрача першае, прадоўжана да 1 кастрычніка г.г.

Пры гімназіі існуюць дзявоцкі і хлапцоўскі інтэрнаты.

Заявы і дакуманты пасылаць на адрас:

Wilno, ul. Ostrobramska Nr. 9.

ТАНЕЙ ЯК УСЮДЫ прадае ўсялякія беларускія кніжкі, школьныя падручнікі і канцэлярскія прылады

Biełaruskaja Kniharnia „PAHONIA"

Vilnia Zavalnaja 6—10

W. A.

SPREČKA PAD KAŚCIOŁAM.

I. (2)

Jacenty. —I ja też ksionżek mam dość wiele:
Hazety nie mam woś tykiele.
Symon. — Kab, pan, bolš dumaŭ i čytaŭ-by,
Skarej-by praŭdy dapytaŭ-by;
Paznaŭ-by, pan, jak-to kaliśći,
Ci dla tytułu, ci karyści
Tut naša šlachta i wialmožy
Staptali ŭsie zakony Božy:
Zrakliś ŭsiaho swajho da ščentu.
I woś tahdy, z taho mamentu,
Pajšło wialika, razarwańnie,
A ŭ nas,—čužyncaŭ panawańnie.
Pany zhubili našu wolu,
A my papali u niawolu.
Ciapier nas ciahnuć za saboju,
Tajej darohaju krywoju:
Kalečać nas i mučać wiečna —
Rabota heta niebiaśpiečna.
Narod žywy: žywoha-ž jeśći...
U was daloka rozum hdzieśći!
Dyk woś naš ksiondz ŭ dastupnaj mowie,
U našym prostym, rodnym słowie,
Staŭ Boha ŭsim ludziam tłumačyć:
Što kožna praŭda wiery značyć.
I jak nam žyć, tałkuje mnoha
I šmat tož inšaha takoha.
Ciapier my stali raźbiracca,
Šyrej pa świecie razhladacca:
Canić siabie i mowu rodnu
I sprawu našuju narodnu.
Kidajem swarki i lamenty...
Što-ž ty na heta, pan Jacenty?
Jacenty, — Ja tut ničoha... To jest—mnoha
Tut narabiŭ ksiondz hety złoha,
Bo narod prosty jon buntuje
I nas woś, šlachtu nie šanuje.
Symon. — A što zrabiŭ jon wam takoje?
Jacenty. — Nu, niby heta, niby toje...
Symon. — Ech, hodzi nam z taboj spračacca;
I musić lepiej raźwitacca?...
Jacenty. — My temu ksiendzu nie darujem:
Woś tolki my jaho škadujem;
A to my zara da dziekana,
My da Biskupa, my da pana
Starosty pojdziem, jak zachočam,
My choć kudy, jak treba, skočym.
Symon. — Tak, tak, wy dobry! pažaleli...
Badaj wy sami toje źjeli!
Jacenty. — Što, moža my małyja dzieci?
My budziem taksabie siadzieci —
A tut tymčasam ważna sprawa!
Jakoje ksiondz tut maje prawa,
Kab mowu prostuju, pahansku,
Ŭ kaścioł unosić? dy pachamsku
Kab nas wučyć? a my nia chłopy!
Symon. — Tak, tak — razumny! Z Europy
Wy samy, samy najmudrejšy!
Jacenty. — Chto-o?
Symon. — Wy, šlachciury ŭsie tutejšy!
Tolki-ž wy kryšačku laniwy,
Jak toj žydoŭski koń falšywy:
Padskočyć ŭ haru i asiadzie,
Choć koł łami jamu na zadzie.
Jacenty. — My na ksiandza, choć škadawali,
A ŭsio-ž, hdzie treba, napisali.
Symon. — Ale-ž jon šlachty nie baicca!
Jacenty. — Dyk my hatowy choć pabicca!
Symon. — Jakto — z ksiandzom? i hdzie — [ŭ kaściele?
Jacenty. — A nam ŭsio roŭna: woś tykiele,
Kab na swaim usio-ž pastawić —
I, jak zachočam, dzieła sprawić.
My jamu zrobim jašče štuki:
Jakraz padłowim ŭ čas nawuki —
Ŭ zapas ludziej z saboju klikniem,
Jak zapiajom, a pośle krykniem...
Symon. — Nu, a jak heta nie pamoža?
Jacenty. — E, kožny štoś ŭ kišeń pałoža...
Symon. — Tož ty kazaŭ — kaścioł šanuješ?...
Jacenty. — Ciapier kažu, ci dobra čuješ?
Tabie skazaŭ ja pad sakretam,
Dyk daniasi ksiandzu ab hetym:
I spać u šapku my nia budziem!
Što padpisali, to' zdabudziem!
Symon. — O, znaju, tak — pany wy ważny!
Wy pry butelcy tož adwažny.
Jak pamahčy, dyk wy tahdy, kaleki.
A jak zachočycie zaškodzić,
Ci ašukać kaho, razwodzić —
Tahdy wy pieršy.
Jacenty. — — Što ty kažaš?
Symon. — A što-ž na heta mnie adkažaš?
Jacenty. — Mužyk ty, chłop ty, durań. chamie!
Niama bolš družby pamiž nami.
Ty, što jazyk swoj raspuskaje?!
Ja šlachcic — chłopie ty, nia znaješ?
O, mnie już dzisiaj dosić tego —
Ja Pławski z Pławskich—syn Pławskiego!
(Wychodzić).

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.